


## У НУМАРЫ


| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
| --- | --- |
| **Кніга водгукаў** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Успаміны і персаналіі** | **З працягу Каляднай традыцыі музея-запаведніка** |
| **Выстава з жывым інтарэсам** | |


## ***Навіны***

### Кніга водгукаў

**2013**

“Вельмі ўдзячны супрацоўнікам музея за цікавую экскурсію і цёплыя адносіны да нас – зацікаўленых сваёй гісторыяй людзей. Вельмі радасна нас сэрцы, што ёсць такія натхнёнгыя людзі ў сваёй прафесіі. Дзякуем ад усяго сэрца і жадаем усяго Вам найлепшага! Беражы Вас Божа!” (10 сакавіка, Паша і Оля).

“Вялікая падзяка ад калектыва вучняў і настаўнікаў ДУА “ВПК д/с-СШ Чачкава” за змястоўныя і цікавыя экскурсіі Канстанцыі Лявонаўне [Шаховіч], Тамары Андрэеўне [Гудына], Людміле Раманаўне [Дакука]. Атрымалі сапраўднае задавальненне! Шчыра дзякуем усім скпрацоўнікам музея” (29 сакавіка, А.М. Сокал).

“Дзякуй за цудоўную выставу ручнікоў! Вельмі цікавая калекцыя! Зычу далейшага развіцця!” (2 красавіка, Васіль Грынь).

“Огромное спасибо пани Алене [Рыдзеўская] за интереснейшую экскурсию по “Млыну”. Именно из таких экскурсий у детей рождается интерес к культуре Родины” (18 мая, СШ №157, г. Мінск).

“Спасибо большое Маргарите [Трапезнікава] за очень приятную экскурсию, за очень интересное общение. Очень милый музей, домашняя обстановка (словно побывала в детстве. Зал музыкальных инструментов и записи музыкальных произведений “того часу” – незабываемы. Маргарита – милая, непосредственная, очень образованная, общительная, вместе с ней экскурсия получилась незабываемой, как будто с нами была наша родственница, которая рассказывала об истории нашего рода!” (22 жніўня, госці з г. Мінск і г. Гомель).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

“Минский Клубный дом “Открытая душа” выражает благодарность сотрудникам музея Маргарите Олеговне [Трапезнікава] и Тамаре Андреевне [Гудына] за тёплый приём и очень интересные экскурсии”.

“Коллектив УЗ “2-я центральная поликлиника г. Минска” искренне благодарит администрацию музея и в особенности Алексея [Лябёдкін] за интересную экскурсию по Вашему музею. Здоровья, счастья Вам! Спасибо!” (22 снежня).

## Успаміны і персаналіі

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах,*

*цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы, як і не ўсе прыведзеныя ў тэксце назвы ўстановаў адпавядаюць сучасным. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [Рэд.]*.

***Як пачыналася***

## МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР,
## ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА

Цікавае адчуванне прыйшло ў Нью-Ёрку — нібыта знаходзішся на вяршыні вялізнай сусветнай гары, адкуль усё добра відаць. Адразу закарцела даваць парады.

*Нью-Ёрк, красавік 1998 г.*

**Ці згаджацца на пасаду дырэктара?**

*Калі не ведаеш – лепш не згаджайся. Не псуй жыццё сабе і людзям.*

**З чаго пачаць згадзіўшыся?**

*З асэнсавання і вызначэння місіі (прызначэння) музея.*

**Як вызначыць місію музея?**

*Добра сфармуляваная місія музея мусіць утрымліваць адказы на наступныя пытанні:*

**Хто** музей ёсць (якая яго назва і дзякуючы якой падтрымцы існуе?)

**Што** ён збірае (якія прадметы будуць уключаны ў музейныя калекцыі)

**Як** ён быў утвораны (з'яўляецца ён суб'ектам прыватнай, карпаратыўнай ці дзяржаўнай уласнасці)?

**Калі** (які перыяд часу ці гістарычная эпоха будуць прадстаўлены ў музейных калекцыях?)

**Дзе** ён збірае (які рэгіён будзе прадстаўлены ў музейных калекцыях – мясцовы, рэгіянальны, нацыянальны, ці міжнародны?)

**Чаму** ён збірае (што будзе рабіць са сваімі калекцыямі?) [1]



*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”, 2000 г.*

**Як прыступіцца да стварэння (абнаўлення) музея?**

*Перш чым прыступацца – адкажы пісьмова на наступныя пытанні:*

1. Якое прызначэнне музея і абмежаванні?
2. Ад якіх відаў падтрымкі музей залежыць?
3. Якія калекцыі існуюць ці мусяць быць сфарміраваны, каб адпавядаць музейнаму прызначэнню?
4. Якія фізічныя рэсурсы спатрэбяцца Вашаму музею?
5. З кім будзе падзелена адказнасць?
6. Якія правілы будуць кіраваць музейнай дзейнасцю?
7. Якім будзе падзел працы і размеркаванне ўлады?
8. Якім чынам будзе дасягацца творчая атмасфера ў калектыве?
9. Якою будзе Ваша палітыка камплектавання?
10. Што трэба прадпрыняць для арганізацыі належнага захавання?
11. Якія ўмовы Вы створыце для арганізацыі даследаванняў?
12. Якія метады прадстаўлення Вы будзеце выкарыстоўваць, каб прыцягнуць сваю публіку?
13. Якога распарадку часу музей будзе прытрымлівацца?
14. Які калектыў штатных і дабрахвотных супрацоўнікаў Вам спатрэбіцца?
15. Колькі будзе каштаваць рэалізацыя кожнага этапа плана?
16. Адкуль возьмуцца грошы для кожнага этапа?

17. Як Вы збіраецеся фарміраваць адносіны з публікай?

18. Як Вы забяспечыце бягучае планаванне?

19. Як Вы будзеце ўдасканальваць формы музейнай дзейнасці?

20. Як Вы збіраецеся падтрымліваць музей жывым, дынамічным, стваральным і радуючым вока? [2]

**Па якіх параметрах ацэньваць музей?**

*Вывучаць музеі – гэта азначае іх наведваць і, свядома ці падсвядома, даваць ім ацэнку, выкарыстоўваючы ўсе папярэднія веды з тэорыі і практыкі.* Канструктыўны падыход да крытычнай ацэнкі музея мусіць залежаць ад рангу пастаўленых пытанняў.

Прапануемы апытальнік, які быў распрацаваны на аддзяленні **Музейнага навучання Лейсесцерскага Універсітэта** (Вялікабрытанія) можна разглядаць як ядро, што з цягам часу і набытым вопытам варта дапоўніць ўласнымі ідэямі і назіраннямі.

*Размяшчэнне*

Дзе музей знаходзіцца? Ці лёгка яго знайсці? Ці нанесаны паштовы адрас? Ці есць стаянка для машын і аўтобусаў? Ці ёсць іншыя прыцягальныя установы на дадзенай тэрыторыі? Як выглядае непасрэднае атачэнне музея? Якое дачыненне яно мае да музея і яго дзейнасці.

*Будынак*

Што гаворыць пра тое, што гэта музей? Ці зразумела па знешняму выгляду, што адбываецца ўсярэдзіне?

Якога ўзросту будынак? Як ён выглядае? Якое ўражанне пакідае інтэр'ер? Гэта спецыяльна пабудаваны, ці прыстасаваны будынак?

Ці падыходзіць ён для размяшчэння музея? Якія яго моцныя і слабыя бакі? Як лёгка ён можа быць узламаным ці падпаленым?

*Уваход*

Наколькі прывабны уваход? Ці лёгка яго адшукаць? Ці ёсць абмежаванні на праходзе? Ці можна праехаць на інваліднай калясцы? Як патрапіць у сярэдзіну з падвойнаю дзіцячаю люлькаю?

Ці адчулі вы гасціннасць? Хто-небудзь заўважыў вас? Ці запатрабавалі грошы? Як паказана ўваходная плата і як прымаецца?

Як апрануты супрацоўнікі? Якія іх адносіны да вас? Ці будуць адносіны аднолькава роўнымі ў выпадках. калі вы: маці з трыма дзецьмі, іншага

колеру скуры, не валодаеце іх моваю ў патрэбнай ступені, ці пятнаццацігадовы падлетак з паўтузінам сяброў?

Ці правярае вас ахова? Чаму? Што вам рабіць са сваімі сумкамі, вопраткаю, парасонам?

Дзе прыбіральня, месца каб пераапрануць дзіця, перасоўнае крэсла? Ці можаце вы прысесці дзе небудзь ў холе, каб пачакаць, напрыклад, сваіх сяброў?

Дзе знаходзіцца музейная крама, кавярня (ці кафейнік у вельмі малых музеях)? Ці пазначаны яны на схеме альбо падпісаныя? Ці пазначана на ўваходзе, што вам рабіць далей, куды ісці?

Ці размешчаны інфармацыя і месцы адпачынку так, каб дапамагаць вам у наведванні музея, выпадкова ці досыць рэгулярна? Яны не сапсавалі ваш добры настрой? Як вы ацэніце іх стандарты?

Як музей зарабляе грошы? Ці клапоціцца пра гэта?

Арганізацыя

Хто дырэктар? Якая яго (яе) адукацыя ці сфера спецыяльнай цікаўнасці? Як разумее роль дырэктара і місію музея?

Колькі чалавек працуе ў музеі? Як вызначаны іх абавязкі? Якая структура штатаў? Як яна спалучаецца з мэтамі і задачамі музея? Ці мяняецца яна? Ці збіраюцца гэта рабіць? Ці відавочна разыходжанне з практычнымі патрэбамі?

На што падобна атмасфера? Ці дэманструе калектыў станоўчыя адносіны да музея і сваіх абавязкаў? Ці гавораць супрацоўнікі дружалюбна і з энтузіязмам? Адкуль музей бярэ энергію і ідэі? Ці мае ён энергію і ідэі? Калі не, то чаму? *[працяг будзе – Рэд.]*

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

*Літаратура*

1. Edson, G., Dean, D. The Handbook for Museums. – Routledge, London & New York. – 1994. – P. 28.

2. George, G. and Sherrell-Leo, C. Starting Right, A Basic Guide to Museum Planning, Nashville, Tenn. : AASLH, 1989. – // Цыт. па Edson, G., Dean, D. The Handbook for Museums. – Routledge, London & New York. – 1994. – P. 27.

## Выстава з жывым інтарэсам

У нашым музеі-запаведніку традыцыйна колькі разоў на год адбываюцца часовыя выставы разнастайнага зместу і тэматыкі. Размяшчаюцца яны, звычайным чынам, у музейна-выставачным комплексе (вул. Рынкавая, 4, Заслаўе). Кожная выстава па-свойму адметная, кожная мае сваю асаблівую атмасферу, якая гуртуе вакол сябе зацікаўленых людзей, утварае адзіную прастору, што часам, здараецца, вельмі творчай. Аднак, бываюць выставы, якія прыцягваюць асаблівую ўвагу наведвальнікаў, “выставы-рэкардсмены”, на якія прыходзяць з асаблівай ахвотай і актыўнасцю.



*Заслаўскі дзіцячы садок №3 на выставе “Маляваны рай” у музейна-выставачным комплексе*

На мяжы 2021-2022 гадоў для нас “выставай-рэкардсменам” па наведванні і ўвазе ў сацыяльных сетках стала часовая экспазіцыя “Маляваны рай”, прысвечаная дыванам-маляванкам як з'яве ў беларускай гісторыі і культуры, падрыхтаваная на аснове нашай уласнай калекцыі “маляванак”, якая з'яўляецца найбуйнейшай у Беларусі. Тэрмін

“Маляванага раю” працягваўся двойчы: планаваны час яе дзеяння – 23 лістапада-31 снежня 2021 г. працягнулі першым разам да 23 студзеня 2022 г., а другім – да 31 студзеня. Тэрмін працягваўся з прычыны асаблівай увагі нашых наведвальнікаў да гэтай выставы, каб усе ахвотныя паспелі яе пабачыць, натхніцца сустрэчай з непаўторнымі ў сваёй вартасці музейнымі прадметамі, зрабіць сабе памяткі ў выглядзе арыгінальных фотаздымкаў.

Прыемна было бачыць фотаздымкі з “Маляванага раю”, якія размяшчалі разам са сваімі пастамі ў разнастайных сацыяльных сетках – “facebook”, “instagram” і іншых, госці нашага музея. У гутарцы наведвальнікі неаднойчы дзяліліся сваімі ўражаннямі і захапленнем, многія казалі, што даведаліся пра выставу ад сваіх сяброў і прыяцеляў і таксама захацелі пабачыць яе на ўласныя вочы, сфатаграфавацца на фоне супольнай мінуўшчыны беларусаў.

Большасць наведвальнікаў адзначанай выставы – дарослыя, але завітвалі на яе і дзеці. Так, напрыклад, на “Маляваны рай” прыходзілі вучні школ і выхаванцы дзіцячых садкоў Заслаўя. Самым маленькім нашым наведвальнікам вельмі падабаліся выявы на дыванках – яны пазнавалі і з ахвотай паказвалі на іх коцікаў, лісіц, мішак, ільвоў... Кожны знаходзіў тут нешта для душы, уласна для сябе – і гэта добра.

## ***<u>Навуковая праца</u>***

### Заслаўе ў беларускай культуры

Галоўны паштамт (Галпаштамт) у г. Мінску, без сумненняў, за многія гады наведалі дзясяткі і дзясяткі тысяч людзей – сярод якіх былі як жыхары сталіцы і рэгіёнаў Беларусі, так і замежнікі. Госці паштамта не толькі карысталіся прапанаванымі ім паслугамі пошты і сувязі, але і выпадкова, а часам – і ўважліва, сузіралі інтэр'ер паштамта, які вылучаўся пэўнымі асаблівасцямі, напрыклад, – вітражамі ў вокнах, створанымі мастаком В. Пазняком у 1980 г. Шэраг вітражоў Галоўнага паштамта дэманструе помнікі архітэктуры Беларусі. Заўважым, што ў іх ліку прадстаўлены і Заслаўскі Спаса-Праабражэнскі сабор (царква), а разам з гэтым і тое, што ў склад

выяў ўключаліся толькі найбольш адметныя і каштоўныя помнікі мураванага дойлідства, бо колькасць іх загадзя абмяжоўвалася колькасцю вокнаў, якія планавалася такім чынам аздобіць.

У 2020 г. РУП “Белпошта” выпусціла спецыяльную серыю паштовак пад назвай “Вітражы паштамта ў Мінску”. На кожнай паштоўцы з серыі выяўлена па адным вітражы Галпаштамта, пры тыражы для кожнай па тысячы экзэмпляраў. Такім чынам, на паштоўку трапіў і вітраж з выявай Заслаўскага Спаса-Праабражэнскага сабора. А гэта значыць, што пабачаць яго не толькі калекцыянеры паштовак, але і многія іншыя людзі і, магчыма, не толькі нашы суайчыннікі, але і замежнікі, бо паштоўкі дагэтуль дасылаюць сваёй радні, прыяцелям і знаёмым у якасці знака ўвагі і шчырага вітання.




*Паштоўка РУП “Белпошта” з серыі “Вітражы паштамта ў Мінску”, 2020 г.*

Гэты прыклад з'яўляецца чарговым пацвярджэннем значнасці заслаўскай гістарычнай спадчыны, яе пашырэння, папулярызацыі ў рэчышчы беларускай культуры. Многія, пачуўшы пра Заслаўе, якраз такі сабе і ўяўляюць велічны белы храм з адной вежай, што стагоддзямі служыў і працягвае служыць людзям у іх пошуку Божае Ласкі. Хтосьці бачыў Заслаўскі Спаса-Праабражэнскі сабор на ўласныя вочы, камусьці ён знаёмы з фота, з сувенірных магнітаў, а камусьці – і з паштовак. Кожны спосаб у такім выпадку мае свой асаблівы сэнс.

### З працягу Каляднай традыцыі музея-запаведніка

Наш музей-запаведнік на працягу дзесяцігоддзяў займаецца вывучэннем Каляднай традыцыі беларусаў і не толькі яе вувучэннем, але і папулярызацыяй, жывым увасабленнем і захаваннем, бо традыцыя жыве да таго часу, пакуль яна ўзнаўляецца, пакуль яе змест вядомы і зразумелы людзям.



*Раставыя лялькі Каза і Мядзведзь вітаюць гасцей*

Першым часам нашы супрацоўнікі больш арыентаваліся на аўтэнтычнасць абраду, пазней — пачалі дадаваць некаторыя сучасныя элементы, з захаваннем арыгінальных персанажаў, беларускіх народных спеваў, танцаў і гульняў, атмасферы весялосці, сапраўднага свята.

Калядная праграма музея-запаведніка традыцыйна праводзіцца на этнаграфічным комплексе “Млын”. Апошнімі гадамі ў яе склад таксама ўваходзіць наведванне тэатралізаванай экскурсіі ў дзіцячым музеі міфалогіі і лесу, дзе гасцей чакаюць Гаспадыня і Баба Яга.



*Млынар разам з дзецьмі*

На этнаграфічным комплексе “Млын” гасцей сустракаюць такія персанажы: Млынар, Калядоўшчыкі, Гаспадыня, Каза, Мядзведзь, Дзед Мароз. Таксама бавяць дзяцей і дзве раставыя лялькі – Каза і Мядзведзь, якія сустракаюць дзятву на вуліцы, водзяць з ёю карагод і ахвотна фатаграфуюцца на добры ўспамін.



*Танец з Казою*



*Выхад Мядзведзя*



*Спеў Калянднікаў і Гаспадыні*

Асноўным чынам праграма арыентавана на дзіцячыя групы, у большасці – гэта вучні школ, у ліку якіх дамінуюць навучэнцы з Мінска і яго

ваколіцы. Гэтай Калядой 2021-2022 гг. удзельнікамі нашай праграмы стала больш як тысяча дзяцей.

Дадаем некаторыя фотаздымкі Каляды музея-запаведніка 2021-2022 гг., якая спрычынілася да захавання агульнабеларускай традыцыі гэтага свята, каб пабачыць яго ў колерах і з тымі людзьмі, якія стваралі яго атмасферу.

Галоўным чынам – гэта нашы супрацоўнікі: Таццяна Уладзіміраўна Арлова, Тамара Андрэеўна Гудына, Алена Юр'еўна Раманюк, Алена Вячаславаўна Пакінка, Ірына Дзмітрыеўна Арцем'ева, Барыс Пятровіч Харэвіч, Святлана Адамаўна Герасімовіч, Людміла Раманаўна Дакука, Вольга Міхайлаўна Крупская, Юлія Уладзіміраўна Вяржбіцкая, Ігар Генадз'евіч Кандратовіч. Не ўсіх іх Вы пабачыце на фота, але кожны з іх браў удзел у праграмах.

Вельмі вялікую дапамогу ў правядзенні Каляднай праграмы цягам многіх гадоў нам аказвае таленавіты музыка, знаўца народных песень і гульняў-забаў – Анатоль Тадэвушавіч Якімовіч. Яго настрой і энергія, спалучаныя са шчырай працай калектыва, даюць добры плён.

А яшчэ дадамо, што ад сэрца будзем рады бачыць усіх ахвотных на Калядах зноў! Завітвайце ў Заслаўе, дзе жывуць традыцыі, хай і ў стылізавана-абноўленай форме, але жывуць і маюць працяг у пакаленнях, бо дзеці – гэта спадчыннікі свету бацькоў, здабыткаў продкаў і агульнай нашай Айчыны.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія Зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.